# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

4 ЖНІЎНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15798)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Re1ikt:
# «Ідэй хапае на два альбомы»

**На іх канцэрты прыходзяць абсалютна розныя слухачы — і брутальныя металісты, і рамантычныя дзяўчаты, і патрабавальныя музычныя снобы. Падчас прэзентацыі новага альбома «Лекавыя травы» гурт з лёгкасцю сабраў аншлаг у адным з найбуйнейшых клубаў сталіцы. Яны выступаюць на прэстыжных еўрапейскіх пляцоўках, але не грэбуюць невялікімі беларускім гарадамі, дзе часам прадстаўляюць больш лёгкую, акустычную версію гучання каманды.**

**Ды і ў цэлым сёння складана ўявіць беларускую рок-сцэну без гурта Re1ikt! Колькі гадоў таму хлопцы літаральна ўварваліся ў свет айчыннай музыкі і, думаецца, надоўга застануцца ў топе. Пра тое, чым сёння жыве адзін з самых запатрабаваных айчынных рок-гуртоў, якія сюрпрызы рыхтуе для слухачоў і чаму так важна камунікацыю з публікай не абмяжоўваць толькі канцэртамі — наша гутарка з лідарам і барабаншчыкам Re1ikt Аляксандрам ДЗЕМІДЗЕНКАМ і гітарыстам гурта Віталём МАКШУНОМ.**

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Адпачыць і зарабіць

# ЗАПІСАЦЦА Ў «КАРАЛІ ДАРОГ»,
## або Тэорыя, падмацаваная практыкай

**З усіх кірункаў працы студэнцкіх атрадаў самым традыцыйным і папулярным з'яўляецца будаўнічы. Байкала-Амурская магістраль, Саяна-Шушанская ГЭС — гэтыя і многія іншыя аб'екты ў савецкія часы сталі знакавымі для студатрадаўскага руху. Як раней, так і цяпер, лідарам у стварэнні будатрадаў у нашай краіне з'яўляецца Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» пабывалі на галоўных аб'ектах, якія ўзводзяцца намаганнямі студэнтаў гэтай ВНУ.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**У беларуска-кітайскім індустрыяльнымі парку студэнты БНТУ займаюцца вязкай арматуры і заліўкай бетону.**

— Сёлета ў нашым універсітэце было сфарміравана 134 атрады, у склад якіх увайшло больш як дзве тысячы чалавек, — расказвае **начальнік штаба працоўных спраў БРСМ БНТУ Юрый РАМАНЧЫК.** — Думаю, пры агульнай колькасці студэнтаў у 15 тысяч — гэта неблагі паказчык. Мы традыцыйна сфарміравалі вялікую колькасць будаўнічых атрадаў, але былі і наваўвядзенні. Сэрвісныя атрады працавалі падчас прыёмнай кампаніі ў нашым універсітэце і ў адной з буйных гандлёвых сетак, а педагагічныя (у БНТУ ёсць профільны інжынерна-педагагічны факультэт) — у дзіцячых лагерах важатымі і сервіснымі рабочымі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Абітурыент—2016

# Рэкорды прыёмнай кампаніі
## Рост балаў на ЦТ павысіў прахадную планку ў ВНУ

**У вышэйшых навучальных установах краіны прыёмная кампанія выйшла на фінішную прамую. Сёння стануць вядомыя прозвішчы тых, хто «ўскочыў у апошні вагон», — быў залічаны на платную форму навучання. Чым жа запомніцца сёлетняя прыёмная кампанія? У першую чаргу, надзвычай высокімі прахаднымі баламі на шэраг спецыяльнасцяў.**

### Тэсты спрасціліся ці падрыхтоўка палепшылася?

382 балы неабходна было набраць сёлета, каб паступіць у БДУ на спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» і «Міжнароднае права». Для таго, каб вывучаць у Белдзяржуніверсітэце «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі», трэба было мець у сваім багажы не менш як 376 балаў, «Сусветную эканоміку» — 367 балаў, «Паліталогію» — 362 балы, «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму» — 361. На «Аўдыявізуальную журналістыку» прахадны бал склаў 370.

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце спасцігаць кітайскую мову на перакладчыцкім факультэце будуць абітурыенты, якія здолелі набраць 377 балаў і больш (размова ідзе пра спецыяльнасць «Кітайская (на базе англійскай) і другая замежная мова»).

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.